Асобныя элементы разгледжаных новых тэхналогій выкарыстоўвалі ў даследуемы перыяд прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы культуры посткатастрофнага соцыуму. Аднак гэтая работа ажыццяўлялася без ведання сучасных тэхналогій, спосабаў дзейнасці і метадаў мастацка-творчай рэабілітацыі. Нізкая эфектыўнасць мерапрыемстваў установаў культуры, скіраваных на аднаўленне здольнасці да сацыяльнага функцыянавання дэзадаптаваных жыхароў Гомельшчыны і Магілёўшчыны, тлумачыцца адсутнасцю ў гэтым соцыуме кадраў, спецыяльна падрыхтаваных да рэабілітацыйнай дзейнасці сродкамі мастацтва.

Такім чынам, перад сацыяльнымі інстытутамі краіны паўстае вострая праблема насычэння сацыякультурнай сферы прафесійна падрыхтаванымі кадрамі, якім давядзецца працаваць у спецыфічных умовах адкрытага мікрасацыяльнага асяроддзя. Гэта павінны быць спецыялісты па аказанні сацыяльнай дапамогі насельніцтву, арганізацыі рознабаковай дзейнасці яго ў сферы вольнага часу, па вырашэнні выхаваўча-адукацыйных задач, карэкцыі паводзін і сацыяльнай рэабілітацыі асобных груп насельніцтва.

**І.М.Стрыжонак**, *ст.выкладчык*

## УДАСКАНАЛЕННЕ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА “БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ФОНДЫ” ЯК АДЗІН СА ШЛЯХОЎ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ (У КАНТЭКСЦЕ ПАТРАБАВАННЯЎ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ)

У праекце дзяржаўнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці Г.12.01.00 “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” даецца характарыстыка зместу прафесійнай дзейнасці спецыяліста, якая прадугледжвае авалоданне тэхналогіяй фарміравання бібліятэчнага фонду, у тым ліку засваенне традыцыйных і сучасных метадаў яго



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэліравання, камплектавання, уліку, арганізацыі, захавання і кіравання.

Набыццё гэтых ведаў забяспечваецца ў працэсе выкладання курса “Бібліятэчныя фонды”, што складае разам з іншымі спецыяльнымі бібліятэказнаўчымі дысцыплінамі аснову прафесійнай адукацыі будучых супрацоўнікаў бібліятэчна-інфармацыйных устаноў.

Удасканаленне методыкі выкладання курса накіравана на фарміраванне творчай актыўнасці студэнтаў, актывізацыю іх пазнавальнай дзейнасці. набыццё навыкаў самастойнага мыслення.

Шляхамі такога ўдасканалення з’яўляюцца распрацоўка і ўкараненне элементаў праблемнага навучання, дыялагічных і спаборніцкіх формаў навучання, выкарыстанне камп’ютэрнай тэхнікі, алгарытмізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Па характары засваення новага вучэбнага матэрыялу метады навучання падзяляюцца на тыя, што 1) садзейнічаюць запамінанню гатовай вучэбнай інфармацыі; 2) прымушаюць студэнтаў самастойна разважаць над праблемнымі сітуацыямі.

Для сучаснага бібліятэчнага спецыяліста ўжо мала фармальнага засваення ведаў. Ён павінен таксама быць падрыхтаваны да вырашэння тэхналагічных задач, якія ўзнікаюць у бібліятэчнай практыцы ў сувязі са з’яўленнем новых дакументаў, укараненнем новай тэхнікі, іншымі фактарамі.

Арыентуюць студэнтаў на пошук лепшых спосабаў, прыёмаў дзейнасці ў розных вытворчых сітуацыях і праблемныя метады навучання.

Што датычыць лекцыйнай работы, то па курсе чытаюцца праблемныя лекцыі, шырока выкарыстоўваецца дыялагічны метад вядзення лекцый. Аглядныя лекцыі дазваляюць павялічыць інфармацыйную ёмістасць выкладання матэрыялу. Ажыццяўляецца абавязковая сувязь з праблемамі прафесійнай дзейнасці.

Тэмы курса, звязаныя з тэхналогіяй фарміравання фонду (іх большасць), студэнтам лепш засвойваць традыцыйным спосабам, з дапамогай тлумачальна-ілюстрацыйнага навучання, калі матэрыял выкладаецца маналагічна, у парадку ажыццяўлення тэхналагічных аперацый.

Праблемнаму выкладанню матэрыялу паддаюцца тэмы "Ядро бібліятэчнага фонду", "Тэорыя фарміравання бібліятэчнага фонду", "Умовы стварэння адзінага рэспубліканскага бібліятэчнага фонду".

Па іншых тэмах курса мэтазгодна ўключэнне праблемных пытанняў, праблемных сітуацый. Напрыклад, у лекцыі па мадэліраванні бібліятэчнага фонду лепш не толькі расказаць аб мадэлях фонду (вербальнай, тэматыка-тыпалагічнай, матэматычнай, графічнай), але і актывізаваць увагу студэнтаў, калі папрасіць іх растлумачыць прыведзеныя прыклады мадэлей.

Ва ўсіх лекцыях не толькі выкладаецца тэорыя, але і даецца матэрыял аб вырашэнні пытання або праблемы ў практычнай дзейнасці бібліятэк.

Развіццю творчых здольнасцей спецыялістаў садзейнічае правядзенне семінараў-дыскусій. У ходзе семінараў, што арганізуюцца як працэс дыялагічных зносін удзельнікаў, адбываецца фарміраванне практычнага вопыту сумеснага ўдзелу ў абмеркаванні і вырашэнні тэарэтычных і практычных праблем фарміравання бібліятэчнага фонду.

Так, на семінары па тэме "Паўната бібліятэчнага фонду" адны студэнты спачатку рыхтуюць невялікія (на 5 хвілін) выступленні аб поглядах на паўнату фонду вядомых спецыялістаў, а потым астатнія выказваюць свой пункт гледжання на такія пытанні, як:

— ці можна падлічыць паўнату фонду і паступленняў;

— ці ўсе раздзелы фонду камплектуюцца з аднолькавай паўнатой;

— як падлічыць паўнату камплектавання;

— ці зможам замяніць паняцце "паўната фонду" паняццем "суадносіны фонду профілю бібліятэкі";



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— з дапамогай якіх паказчыкаў можна падлічыць адпаведнасць фонду чытацкім патрэбам і інш.

Акрамя глыбокіх тэарэтычных фундаментальных ведаў, аснову прафесійнай кампетэнцыі спецыяліста складае ўсебаковая практычная падрыхтоўка, што ажыццяўляецца ў ходзе лабараторна-практычных заняткаў.

Задачу набыцця навыкаў будучай прафесійнай дзейнасці дапамагаюць вырашаць метады, звязаныя з мадэліраваннем, імітацыяй вытворчых сітуацый.

Так, метад аналізу канкрэтных сітуацый эфектыўны пры правядзенні лабараторна-практычнай работы па тэме "Колькасны аналіз якасці камплектавання бібліятэчнага фонду".

Студэнты, выкарыстоўваючы метады вывучэння фонду (статыстычны, бібліяграфічны, аналітычны), выяўляюць прычыны недахопаў выкарыстання асобных выданняў, вызначаюць спосабы далейшай работы з імі (спісанне выданняў, накіраванне ў абменны фонд, у дэпазітарый).

Калі згодна з другім варыянтам работы студэнты вырашаюць праблемы дакамплектавання фонду, то з дапамогай бібліяграфічнага і сацыялагічнага метадаў яны выяўляюць пропускі ў раздзелах фонду з высокай абарачальнасцю.

Па заканчэнні работы праходзіць абмеркаванне праведзеных мерапрыемстваў, адбываецца абарона кожнага варыянта, ацэньваюцца вынікі.

У форме вучэбна-дзелавой гульні праходзяць лабараторна-практычныя заняткі па распрацоўцы тэматыка-тыпалагічнай мадэлі бібліятэчнага фонду. Складаюцца яны з трох этапаў:

— першы, падрыхтоўчы, калі студэнтам прапануюць дакладную бібліятэчную сітуацыю, па якой тыя вывучаюць эканамічны профіль абслугоўваемай зоны, чытацкі кантынгент бібліятэкі, раздзел фонду, па якім фарміруецца мадэль;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— другі заключаецца ў распрацоўцы кожным фрагмента агульнай мадэлі, вызначэнні канкрэтных тэм, тыпаў і відаў выданняў, аптымальнай экземплярнасці дакументаў;

— трэці з іх мае на ўвазе напісанне пісьмовага заключэння, у якім тлумачацца прынятыя рашэнні.

У ходзе гэтых заняткаў:

— адбываецца імітацыя вытворчай дзейнасці;

— рэалізуецца прынцып дыялагічнага навучання (па кожным раздзеле фонду працуюць 2—3 студэнты, таму дыялог прадугледжваецца ў працэсе прыняцця рашэння па кожным з элементаў мадэлі: тэме, тыпе, відзе дакумента, яго экземплярнасці);

— ажыццяўляецца прынцып праблемнасці праз наяўнасць дакладнай праблемы. У гэтым выпадку, калі адбываецца мадэліраванне фонду, пошук правільных рашэнняў бывае звязаны з праблемамі аптымізацыі бібліятэчнага фонду, прывядзення яго ў адпаведнасць профілю бібліятэкі.

Лабараторна-практычныя заняткі накіраваны на авалоданне практычнымі навыкамі, уменнямі. Яны добра замацоўваюцца тады, калі дакладна выяўляюцца або аперацыйны бок навыку, або лагічныя паслядоўнасці дзеянняў, неабходных для вырашэння тыповай задачы. Так, у тэхналогіі камплектавання па напаўненні фонду гэта:

— аналіз патоку дакументаў з дапамогай перспектыўных і бягучых бібліяграфічных дапаможнікаў;

— першасны адбор дакументаў;

— пошук крыніц, спосабаў, формаў дакумента-забеспячэння;

— заказ дакумента;

— прыём новых дакументаў.

Большасць пералічаных аперацый паддаецца алгарытмізацыі.

Лагічна пабудаваная паслядоўнасць дзеянняў па камплектаванні фонду дазваляе шляхам практыкаванняў замацаваць у студэнта адпаведны навык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Алгарытмізацыя пазнавальных працэсаў, звязаных з прафесійнай дзейнасцю, збліжае, інтэгруе інтэлектуальныя патэнцыялы студэнтаў—выканаўцаў задання.

Алгарытмізацыя ў ходзе выкладання курса “Бібліятэчныя фонды” з’яўляецца не толькі сучасным, рацыянальным спосабам фарміравання прафесійных ведаў і навыкаў, але і сродкам развіцця тэхналагічных здольнасцей будучага спецыяліста.

Методыка выкладання курса “Бібліятэчныя фонды” мае шэраг недахопаў. Таму патрабуецца яе пастаяннае ўдасканаленне, якому будзе спрыяць вырашэнне такіх метадычных задач:

— фарміраванне банка праблемных пытанняў сумеснымі намаганнямі ўсіх выкладчыкаў дысцыпліны для сістэматычнага выкарыстання на лекцыях, семінарах, лабараторна-практычных занятках;

— дзеля актывізацыі даследчай работы па курсе шырэйшае выкарыстанне шэрага даследчых метадаў у розных відах заняткаў;

— для паглыблення практычнай падрыхтоўкі студэнтаў стварэнне вучэбна-навукова-вытворчага комплексу, які ўключаў бы універсітэт культуры (факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм), шэраг спецыяльных або універсальных навуковых (публічных масавых) бібліятэк, што даюць базу, патрэбную для правядзення лабараторна-практычных заняткаў па курсе.

Заняткі ў бібліятэках, самастойнае выкананне заданняў пад кантролем не толькі выкладчыка, але і супрацоўніка бібліятэкі вельмі эфектыўныя, асабліва калі ёсць магчымасць адвесці на іх поўны вучэбны дзень. Гэта будзе спрыяць паляпшэнню засяроджанасці студэнтаў на выкананні заданняў, фарміраванню практычных навыкаў бібліятэчнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ